Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (142), 2024

УДК 821.162.1-31:94(476)«20» EDN: JXQKXY

# Вобразная сістэма рамана Евы Фялінскай «Пан дэпутат»

Г.А. Гладкова

У артыкуле прааналізавана сістэма мастацкіх вобразаў рамана «Пан дэпутат» («Pan deputat», 1852), польскамоўнай пісьменніцы з беларускіх земляў Евы Фялінскай (Ewa Felińska, 1793–1859). Звяртаецца ўвага на ступень даследаванасці творчай спадчыны пісьменніцы айчыннымі і замежнымі літаратуразнаўцамі, удакладняецца жанравая спецыфіка рамана Фялінскай, вызначаецца ідэйная накіраванасць яе мастацкай прозы.
**Ключавыя словы:** эксдывізія, бытавы раман, містыфікацыя, мастацкі вобраз, кампазіцыя, тапанімічная прастора, жанр, стыль.

The article analyzes the system of artistic images of the novel «Pan deputat» (1852) by the Polish-speaking writer from the Belarusian lands Eva Felinska (Ewa Felińska, 1793–1859). The attention is drawn to the extent of research of the writer's creative heritage by domestic and foreign literary critics; the genre specificity of Felinskaya's novel is clarified, the ideological orientation of her fiction is determined.
**Keywords:** exdivision, everyday novel, hoax, artistic image, composition, toponymic space, genre, style.

Імя Евы Фялінскай вядомае айчынным літаратуразнаўцам дзякуючы намаганням навукоўцаў Адама Мальдзіса, які першым згадаў пра пісьменніцу ў нарысах «Падарожжа ў XIX стагоддзе» [1], і Ірыны Бурдзялёвай, якая прааналізавала выбраную мастацкую і мемуарную спадчыну Фялінскай [2], [3]. Як вядома, пісьменніца паходзіла са збяднелай шляхецкай сям'і на Случчыне, частку жыцця правяла на Валыні, частку – у Сібіры (г. Бярозаў) і Саратаве. Біяграфічныя звесткі пра пісьменніцу ў сваіх працах падрабязна згадала І. Бурдзялёва, якая падкрэсліла, што *«постаць Евы Фялінскай выклікала ў сучаснікаў нязменную павагу сілай духу, жыццёвай трываласцю, загартаваным характарам і высокай грамадзянскай свядомасцю»* [2, с. 122]. Этнаграфічны бок мемуараў Фялінскай даследавала Ларыса Лойка [4]. У замежным літаратуразнаўстве пра Е. Фялінскую згадвалі ў сваіх даследаваннях Пётр Хмялёўскі, Ванда Воўк-Гумпловіч, Габрыэль Корбут, Оскар Кольберг [5], [6], [7]. Так, беларускі кантэкст раманаў літаратаркі ахарактарызаваў у працы «Беларусь-Палессе» О. Кольберг, зазначыўшы, што *«w powieściach swych (Siostrzenica i ciocia oraz Pan Deputat) napisanych z pozycji patriarchalnej pańszczyzny autorka składa odpowiedzialność za ciemiężenie chłopów białoruskich na economów i oficjalistów»* (у сваіх раманах («Пляменніца і цётка» і «Пан дэпутат»), напісаных з пазіцыі патрыярхальнага прыгоннага права, аўтарка ўскладае адказнасць за прыгнёт беларускіх сялян на эканомаў і чыноўнікаў) [6, s. XIV].

Творчая спадчына Фялінскай складаецца з некалькіх раманаў («Герсылія» (1849), «Пан Дэпутат» (1852), «Пляменніца і цётка» (1853)), а таксама мемуарнай прозы («Успаміны аб падарожжы па Сібіры і побыце ў Беразове» (1849) і незавершанага трохтомніка «Дзённікі Евы Фялінскай»). Тапанімічная прастора мастацкай прозы пісьменніцы ахоплівае Літву, Белую Русь, Палессе, Валынь. У раманах месцам дзеяння становяцца маёнткі на Палессі і Валыні, згадваюцца Мінск, Слуцк, Магілёў, Вільня.

Каштоўнасць літаратурных твораў Е. Фялінскай бачыцца ў адлюстраванні пабытавага жыцця ліцвінскай шляхты, спачуванні становішчу сялян, крытыцы эгаізму, сквапнасці заможных прадстаўнікоў грамадства. Аналізуючы раман Е. Фялінскай «Пляменніца і цётка», І. Бурдзялёва вылучае рысы бідэрмайерызму ў ім. Сапраўды, твор адметны аўтарскай увагай да бытавых элементаў, засяроджанасці на абставінах прыватнага жыцця. Адзначым таксама, што бытавы раман не пазбаўлены модных у той час элементаў містыфікацыі. Адметнасцю мастацкай манеры пісьменніцы з'яўляецца прыём паралельнага разгортвання некалькіх сюжэтных ліній, пастаяннае «пераключэнне» падзей, увага да дэталяў, некаторая экзальтаванасць герояў у сітуацыях сардэчнай прыязнасці.

Заўважым, што адзначаныя раманы («Пан дэпутат», «Пляменніца і цётка») збліжае агульнае кола праблем. Як правіла, у цэнтры пісьменніцкай увагі знаходзіцца катастрофа шля-

хецкіх гаспадарак, абкладзеных даўгамі, што выклікае пагрозу эксдывізіі (падзелу маёмасці паміж крэдыторамі). Як слушна падкрэсліла І. Бурдзялёва, *«распад маральна-этычнай сістэмы каштоўнасцей, адыход ад шляхецкага традыцыяналізму і прынцыпаў грамадскай супольнасці прывялі да эканамічнага калапсу магнацкіх і шляхецкіх гаспадарак. [...] Шляхта, гонячыся за магнатамі, бяздумна марнавала назапашаную пакаленнямі спадчыну. Заложаныя маёнткі аддаваліся пад эксдывізію, якая ператварылася ў агульнаграмадскую навалу»* [2, с. 128].

На пачатку XIX ст. адбывалася рэзкае павелічэнне судовых разбораў шляхецкай маёмасці, абкладзенай даўгамі. Прычынай такой сітуацыі быў высокі кошт на збожжа, што напачатку дазволіла значна павялічыць матэрыяльныя рэсурсы, весці раскошны лад жыцця, усталявалася практыка ўзяцця крэдытаў, якімі карысталася шляхта. Аднак вайна 1812 г. і пасляваенны перыяд змянілі эканамічныя абставіны, многія даўжнікі не маглі пагасіць крэдыты і вымушаны былі аддаваць маёмасць пад разбор. Менавіта гэта эканамічная праблема 1820-х гг. становіцца асновай сюжэтных калізій раманаў Е. Фялінскай. На фоне эканамічных абставін разгорваюцца шматлікія сямейныя стасункі герояў. Цікавіць пісьменніцу маральная праблематыка: грошы, матэрыяльны прыбытак разглядаюцца як спакуса для чалавека, гатовага страціць сумленне. Закранае Фялінская вечную праблему бацькоў і дзяцей, узаемадачыненняў родных людзей, паказвае, што слабасці чалавечай натуры часам становяцца прычынай скасавання кроўных сувязей.

Героі раманаў Е. Фялінскай, якіх можна ўмоўна падзяліць на некалькі груп, прадстаўляюць розныя станы тагачаснага грамадства. Як правіла, у творах прысутнічаюць staноўчыя героі-носьбіты аўтарскага ідэалу. Часам мы можам заўважыць, што мастацкі вобраз надзяляецца рысамі характару, відавочна, уласцівымі добра знаёмым аўтарцы людзям. Так, галоўны герой рамана «Пан дэпутат» нагадвае некаторымі псіхалагічнымі адметнасцямі натуры спадарожніка жыцця пісьменніцы – Герарда Фялінскага. З біяграфіі апошняга вядома, што яму была ўласцівая апатыя, дапамогай ад якой стала падарожжа за мяжу на два гады (аналагічна Альбін Закліка ад хандры ратуецца двухгадовым жыццём за мяжой), Герард быў чалавекам, які марыў выхаваць у сялян пачуццё ўласнай годнасці, ён даваў ім максімум свабоды, выкупаў з рэкрутцва, хаця сяброў сярод сялянства не меў. Гэтыя дэталі нагадваюць Альбіна Закліку, якому таксама ўласцівыя мары пра паляпшэнне сялянскага жыцця і імкненне быць бліжэй да мужыкоў. Характарызуючы Альбіна, пісьменніца адзначала, што герой сам вырашыў *«zbliżyć się do chłopów»*, пабуджаць іх да выказвання ўласных патрэб, каб *«ich podnieść do uczucia własnej godności»* [8, s. 51].

У рамане «Пан дэпутат» сустракаецца эпізод палявання на мядзведзя, які адбыўся ў сапраўднасці, месца дзеяння (Белая Русь, Літва, Палессе, Валынь) таксама добра вядомае пісьменніцы з жыцця. Другі рэальны эпізод у творы – апісанне выкупу сялянамі даўгоў свайго шляхціча-гаспадара, каб пазбегнуць эксдывізіі не столькі гаспадарскага маёнтка, колькі вёсак, дзе жывуць сялянскія сем'і. Відавочна, што характары, якія стварае Фялінская, блізка стаяць да рэальнасці, яны адпавядаюць тагачаснай рэчаіснасці, што сведчыць пра рэалістычную, жыццёвую аснову творчасці пісьменніцы.

Асоба Альбіна Заклікі, гісторыя яго жыцця стаяць у цэнтры рамана «Пан дэпутат». Менавіта гэты герой абраны дэпутатам галоўнага суда і вымушаны выконваць грамадскія абавязкі, хаця не надта разбіраецца ў пытаннях права. Паказальна, што на спробу Альбіна адмовіцца яму кажуць, што веданне права не асабліва патрэбнае, галоўная справа напачатку – даць абед для абывацелей. Па натуры Альбін – чалавек мяккага характару, нават наіўны ў многіх пытаннях, празмерна даверлівы. Герой існуе больш у сваіх марах пра паляпшэнне жыцця сялян, ён лянівы да дзеянняў, і гэту рысу пісьменніца дакладна называе, абмалёўваючы характар персанажа. Такая адарванасць паніча ад рэалій жыцця прыводзіць да сумных вынікаў: не ўчытаўшыся ў паперы, Альбін надзяляе правам кіравання сваёй уласнасцю чалавека, схільнага да падману, які не толькі нажываецца на сялянах пана Заклікі, але яшчэ цягне грошы з гаспадара маёнтка. Думаецца, у героя адсутнічае крытычнае стаўленне да людзей: у яго доме могуць месяцамі бавіць час, гасцяваць мала вядомыя гаспадару людзі, Альбін не ўмее эканоміць, даўгі на маёнтку велізарныя. З дзяцінства адгароджаны ад праблем, Альбін не мае вопыту, не можа клапаціцца пра жонку, нават спроба героя працаваць настаўнікам не дае плёну, бо ўніверсітэт Альбін не скончыў і ўвогуле праца яму здавалася надта цяжкім заняткам.

Такім чынам, Ева Фялінская стварыла партрэт шляхціча, які прадстаўляе маладое пакаленне, не здольнае да дзейнасці, учынкаў, наіўнае і адарванае ад рэчаіснасці. У гэтым бачыцца

слабасць шляхты, якая не мае здольнасці застацца дзейснай часткай грамадства. Пасля страты любай жонкі Альбін, нарэшце, зразумеў, што яго няўважлівасць і лянота прывялі да трагічнага выніку. Аднак праз некаторы час герой вяртаецца да ілюзій і працягвае існаванне ў сваім прыдуманым свеце. Цікава, што пра Альбіна пісьменніца заўважае, што гэта быў «człowiek znudzony» [8, s. 118] («тужлівы чалавек»). Верагодна, сплін, нуда героя – адсылка да асноўнага псіхалагічнага адчування герояў-рамантыкаў пачатку XIX ст.

Думаецца, што аўтарскі ідэал у рамане «Пан дэпутат» – гэта пан Монтвід, які выконвае другарадную функцыю ў падзеях, аднак з'яўляецца носьбітам не толькі лепшых рыс чалавечай натуры, прагрэсіўных поглядаў, але таксама тым героем, дзякуючы якому адбудзецца справядлівая развязка сюжэта. Монтвід валодаў вялікім маёнткам на Палессі, цікавіўся аграноміяй, палітэканоміяй, лічыў гэтыя навукі карыснымі для патрэб краю. Пан клапаціўся пра паляпшэнне быту вяскоўцаў, што не было простай справай, улічваючы неўраджайнасць глебы, галечу, «звычайную для палескага люду» з пакалення ў пакаленне. Паніч вывучыў мясцовую прыроду, багатую на лясы і шматлікія рэкі, злучэнне якіх з Балтыйскім морам каналамі адкрывае выдатныя магчымасці для гандлю дрэвам. Монтвід адкрывае ў сваіх уладаннях лясныя фабрыкі, з якіх драўніна, смала і іншыя рэчы накіроўваюцца да Чорнага і Балтыйскага мора. Ён дазваляе сялянам мець уласныя промыслы, наладжваць свой гандаль, пан нават стварыў банк пазыкі для сялян, што дазволіла ў хуткім часе дабрабыту змяніць былую галечу. Пан Монтвід сам сачыў за справамі, не меў аканомаў ці іншых пасрэднікаў у стасунках з мужыкамі, і гэта давала свой плён. Акрамя таго, што герой быў здольным прадпрымальнікам, ён шмат чытаў, меў час на занятак музыкай, вызначаўся высокамаральнымі паводзінамі. Жонка пана Монтвіда была яму надзейнай спадарожніцай і памочніцай. Яна апекавалася над шпіталем, на святы запрашала сялянскіх дзяцей у маёнтак, рабіла пачастунак, распытвала, у каго якія здольнасці. Схільных да навукі сялянскіх дзяцей яна вучыла грамаце, здольных аддавала вучыць рамяству. Пані Монтвід займалася таксама маральным выхаваннем сялянскіх дзяцей. Відавочна, што апісанне ладу жыцця Монтвідаў дэманструе аўтарскія ўяўленні пра паляпшэнне жыцця на Літве і Беларусі, адукаваная шляхта, якая клапоціцца пра сваіх сялян, на думку аўтаркі, здольная прынесці плён свайму народу.

Жонка Альбіна Заклікі Клара таксама акумулюе лепшыя рысы, уласцівыя шляхетнай паненцы: прыстойная дзяўчына, верная жонка, здольная на самаахвярнасць дзеля сям'і і любага мужа. Клара становіцца неабходнай падтрымкай Альбіну, менавіта яна – дзейсная спадарожніца, тая, хто накіроўвае мужа да прымання рашэнняў, хто здольны рэалізаваць ідэальныя ўяўленні Альбіна. Клара першая разумее, што трэба быць бліжэй да сялянства, што выратаванне – не ў горадзе, а ў жыцці побач з народам. Яна не баіцца работы і падштурхоўвае да гэтага мужа, жанчына шукае выйсце з цяжкай эканамічнай сітуацыі, у якой апынулася гаспадарка, разрабаваная аканомам Стралкоўскім з-за недагляду гаспадара. Пісьменніца невыпадкова дае герою такую спадарожніцу жыцця: толькі Клара можа адкрыць у характары мужа тыя рысы, якія стануць яго выратаваннем. Аднак трагічная смерць Клары поўнасцю пазбаўляе чытача надзеі, што Альбін будзе здольны выратаваць маёмасць. Паведамленне, што пасля смерці жонкі Альбін зноў пачаў жыць ідэямі, а не рэальнасцю – пісьменніцкі прысуд слабай шляхце, якая не здолее ўтрымацца ў змененых сацыяльных абставінах.

У рамане Е. Фялінская стварыла некалькі эпізодаў, якія паказваюць, як лёгка даверлівыя людзі станавіліся дабычай ашуканцаў. Так, у гэтым плане паказальная гісторыя Ісідора Ардзвіла (Ordzwiłł, як адзначыла Е. Фялінская, – літоўская шляхта з Валыні), які быў ашуканы і пазбаўлены маёмасці дзякуючы каварству пана Жміеўскага. Ісідор перапісаў маёнтак на жонку і яе дачку ад першага шлюбу, пазней зразумеў, што стаў ахвярай ашуканства. Жонка Ісідора загінула, яго маёнтак перайшоў ва ўладанне першага мужа, які апекаваўся над дачкой. Фялінская была ўпэўнена, што падманам набытае багацце не прынясе карысці. Гэта думка пацверджана шэрагам эпізодаў рамана: па-першае, трагічна загінула жонка Ісідора, якая паквапілася на маёмасць паніча і не кахала яго, па-другое, дачка Ізабэла, да якой перайшоў маёнтак пасля смерці маці, была ўпэўнена, што яго трэба вярнуць законнаму ўладальніку. Божай карай за падман маці становіцца страта Ізабэлай адзінага сына-падлетка, які таксама загінуў пры трагічных абставінах. Як вынікае з сюжэта, існуе вышэйшая справядлівасць, трагічны ланцуг падзей – заканамерная расплата за ашуканства, падман, здрадніцтва.

Па словах А. Мальдзіса, *«Ева Фялінская асуджала гультаяватую шляхту, якая бавіла час за картамі, гарэлкай і плёткамі»* [1, с. 191]. Шматлікія вобразы прадстаўнікоў шляхты даказваюць гэта меркаванне вучонага. З горкай іроніяй пісьменніца адзначала, што працей *«знайсці папарацькветку ці мець на паслугах д'ябла»*, чым сярод шляхты адшукаць таго, хто не прагнуў бы грошай.

Адметнасцю кампазіцыі рамана стала ўвядзенне ў тэкст устаўнога элемента – рукапісу маці Людвіка (сябар Альбіна з юнацкіх гадоў). Рукапіс уяўляе сабой поўнасцю самастойны твор, які змяшчае аповед пра таямніцу паходжання Людвіка. Насамрэч, хлопец – апошні прадстаўнік роду Ардзвілаў, сын Ісідора, калісьці жорстка падманутага махлярамі. Падлетка, пазней маладога шляхціча Людвіка некалькі разоў спрабавалі забіць хаўруснікі пана Жміеўскага – галоўнага ворага згаданага літвінскага роду.

З поўным правам можна назваць раман «Пан дэпутат» раманам з дэтэктыўным сюжэтам. У творы апісана некалькі замахаў на жыццё Людвіка, адбываецца жорсткае забойства Ісідора, імя злодзея адкрываецца на апошніх старонках рамана. Прыгодніцкі сюжэт з крымінальным элементам працуе на займальнасць твора, што дазваляе гаварыць пра жанравы сінкрэтызм прозы Е. Фялінскай. І. Бурдзялёва падкрэслівала схільнасць пісьменніцы да бытавой дэталізацыі, адзначала асаблівую ўвагу да прадметаў інтэр'еру. З мастацкіх прыёмаў, якімі карыстаецца Фялінская, вылучым таксама гаваркія імёны герояў (Альбін – *«белы»*, Клара – *«светлая»*, Людвік – *«слаўны ваяр»*, адмоўны персанаж Адольф – *«высакародны воўк»*), параўнанні («przyczepił się do Albina *jak pająk do muchy*» [5, s. 113]), народныя выслоўі (*«kto smaruje, ten jedzie»*), сінекдаху («… jedna była ubrana w pióra błęitne, druga w mak pąsowy […] – Czy uważasz jak Malwina Pręcińska przez cały wieczór w złym humorze? – *rzecł mak pąsowy do piór błękitnych*» [8, s. 208]), увядзенне ў тэкст галіцызмаў для адлюстравання культурнага ўзроўню шляхты.

Паказальна, што Е. Фялінская спрабуе псіхалагічна абгрунтаваць сяброўства Людвіка і Альбіна, матывуючы гэта тым, што больш слабыя натуры (Альбін) заўсёды імкнуцца да больш моцных і мужных (Людвік). Тэма вернага сяброўства праходзіць праз увесь раман, нават той факт, што Альбін узяў шлюб з каханай дзяўчынай Людвіка не змяніў высакароднага сяброўства герояў.

Аповед пісьменніцы часам перарываецца апісаннямі палескіх краявідаў, напрыклад, Е. Фяліская адзначала сярод адметнасцей Палесся раўніннасць мясцовасці, пясчанасць глебы, вялізны лясны гушчар, які перамяжоўваецца багнай і рэкамі, што разліваюцца і перапыняюць камунікацыю паміж вёскамі на многія тыдні. Тапанімічная прастора рамана дакладна акрэсленая: падаюцца назвы вёсак, мястэчкаў, гарадоў, у якіх спыняюцца героі, апісаны водны шлях па Дняпры з месца, дзе зліваюцца Прыпяць і Днепр, да Магілёва, куды накіроўваецца маці Людвіка з сынам, ратуючыся ад пераследавання.

Такім чынам, аналіз вобразнай сістэмы рамана Е. Фялінскай «Пан дэпутат» дазваляе вылучыць наступныя адметнасці мастацкага адлюстравання рэчаіснасці ў творы: па-першае, у цэнтры ўвагі пісьменніцы знаходзяцца, як правіла, прадстаўнікі шляхты. Пры гэтым Фялінская вылучае розныя яе тыпы ў залежнасці ад маёмаснага стану, а таксама ад высакароднасці характару. Пісьменніцу цікавіць становішча дробнай шляхты, якая апынулася на пачаку XIX ст. перад пагрозай страты маёмасці праз эксдывізіі, што ўплывала на традыцыйны ўклад жыцця. Галоўныя героі твора (Альбін Закліка, яго жонка Клара (у дзявоцтве Налецкая), сябар Людвік Ардзвіл) вымушаны сутыкнуцца са складанымі абставінамі жыцця (пагроза эксдывізіі (Альбін), сіроцтва (Клара), таямніца паходжання (Людвік)), аднак яны не толькі не здаюцца, але перамагаюць абставіны. Невыпадкова Фялінская падкрэслівае, што няшчасце або забівае чалавека, або загартоўвае яго, умацоўвае дух.

Аднак, калі Клара і Людвік – гэта характары герояў-змагароў з абставінамі лёсу, то вобраз Альбіна не такі адназначны. Слабасць героя, наіўнасць і празмерны давер ператвараюцца ў недахопы яго характару. Відавочна, што, ствараючы вобраз Альбіна і звязваючы з гэтым героем назву рамана, Фялінская паставіла на мэце стварэнне характэрнага для тагачаснай рэчаіснасці героя, не здольнага быць практыкам і ашчадна ставіцца да гаспадаркі. Наяўнасць такіх «гаспадароў» прыводзіла шляхецкія маёнткі да падзелу паміж крэдыторамі, ускладняла сітуацыю тое, што такія шляхцічы не гатовы былі мяняць стыль жыцця, забяспечваць самі сябе, брацца за працу. Заслуга Е. Фялінскай – у стварэнні такога характару, у асэнсаванні прычын эканамічнага заняпаду шляхты.

Нягледзячы на аўтарскае жанравае вызначэнне твора як бытавога рамана, удакладнім, што ён таксама ўтрымлівае элементы іншых жанравых разнавіднасцей (прыгодніцкага рамана з крымінальнай інтрыгай, дэтэктыўнага рамана, рамана сацыяльна-бытавога). Такі жанравы сінкрэтызм сведчыць пра зацікаўленасць пісьменніцы пытаннем чытацкай рэцэпцыі. Разгортванне некалькіх сюжэтных ліній паралельна ў часе, спроба псіхалагічнай матывацыі стасункаў герояў сведчаць пра літаратурны талент пісьменніцы і яе неабыякавасць да сацыяльных праблем краю.

## Літаратура


1. Мальдзіс, А. І. Падарожжа ў XIX стагоддзе : з гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры : навук.-папул. нарысы / А. Мальдзіс. – Мінск : Народная асвета, 1969. – 206 с.
2. Бурдзялёва, І. А. Рэпрэзентацыя гістарычнай памяці ва «Успамінах» Евы Фялінскай / І. А. Бурдзялёва // Вестник МГЛУ. – 2011. – № 3. – С. 122–130.
3. Бурдзялёва, І. Праявы бідэрмайерызму ў рамане Евы Фялінскай «Пляменніца і цётка» / І. Бурдзялёва // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы IX Міжнар. навук. канф., прысвеч. 70-годдзю філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Мінск, 15–17 кастр. 2009 г. : у 2-х ч. / пад рэд. праф. В. П. Рагойшы ; рэдкал.: А. М. Андрэеў (нам. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2010. – Ч. 1 : Беларуская літаратура: «Усход»–«Захад» ; Беларуская літаратура : гісторыя і сучаснасць ; Міфалогія-фальклор-літаратура : праблемы паэтыкі. – С. 113–117.
4. Лойка, Л. Е. Этнографические исследования Е. Фелинской / Л. Е. Лойка // Женщины-ученые Беларуси и Казахстана : сб. материалов Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 1–2 марта 2018 г. ; редкол.: И. В. Казакова [и др.]. – Минск : РИВШ, 2018. – С. 60–62.
5. Chmielowski, P. Autorki polskie wieku XIX : studyum literacko-obyczajowe / P. Chmielowski. – Warszawa : Spółka Nakładowa Warszawska, 1885. – Ser. 1. – 541 s.
6. Kolberg, O. Białoruś-Polesie / O. Kolberg. – Warszawa : Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1968. – 571 s.
7. Korbut, G. Literatura polska od początków do wojny światowej / G. Korbut. – Wyd. 2. – Warszawa, 1930. – T. 3 : Od roku 1820 do roku 1863. – S. 501–502.
8. Felińska, E. Pan deputat / E. Felińska. – Wilno : Józef Zawadzki, 1852. – T. 1. – 240 s.


Витебский государственный
университет имени П.М. Машерова

Поступила в редакцию 22.02.2023